## Табе, мой горад, прысвячаю...

*Мой Талачын, мая Радзіма.*
*Мае палеткі і лясы.*
*Мяне тут маці нарадзіла,*
*Сказала: «Усё тваё тут, сын»...*
*Віктар Бірукоў, "Споведзь"*

Няма на зямлі нічога радней і бліжэй, чым малая радзіма. Яна ёсць у кожнага з нас. І ўсе мы аднолькава моцна любім той адзіны куток зямлі, дзе з'явіліся на свет і пачулі матчыну калыханку… Мінулы год, які быў абвешчаны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Годам малой радзімы, стаў часам для кожнага з нас успомніць пра месца, да якога прыкіпелі душой і сэрцам, да якога заўсёды імкнемся, часам аддачы доўга куточку роднай зямлі ведамі, уменнем, вопытам.

Мы, бібліятэкары, аддаць доўг сваёй малой радзіме можам актыўнай краязнаўчай працай: ушаноўваннем імёнаў вядомых землякоў; напісаннем гісторый сваіх вёсак, гарадоў, раёнаў; зборам этнаграфічных, фальклорных, тапанімічных матэрыялаў; правядзеннем асветніцкай работы па вывучэнню гісторыі, культуры, прыроды роднага краю.

Асабліва плённы гэты час стаў для супрацоўнікаў Талачынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі. 2018 год - год 585-годдзя з часу першага ўпамінання горада Талачын у пісьмовых крыніцах.

З гэтай нагоды ў бібліятэцы і па за яе межамі на працягу мінулага года праходзілі цікавыя мерапрыемствы, мэтай якіх стала вывучэнне мінулага і сапраўднага нашага горада і краю ў цэлым. Былі арганізаваны кніжныя выставы пад назвамі "Талачын у люстэрку часу" і "Тут радзімы маёй пачатак". На выставах знайшлі месца кнігі пра горад і край, паэтычныя зборнікі мясцовых паэтаў, буклеты серый "Ведай свой край" і "Славутыя імёны Талачыншчыны", дэкаратыўныя вырабы умельцаў.

"Хто напісаў верш "Ода Талачыну", "Што зрабіў для горада Леў Сапега", "У якім годзе наш горад быў падзелены на дзве часткі ракой Друць паміж Расійскай імперыяй і Рэччу Паспалітай?", "Калі Напалеон Банапарт затрымліваўся ў Свята-Пакроўскім жаночым манастыру" – на гэтыя і іншыя пытанні адказвалі талачынскія школьнікі на бібліяквэсце "Культурны код Талачына". На шасці прыпынках камандам трэба было сабраць ключавую фразу – "Наша радзіма – горад Талачын". Школьнікі не разгубіліся перад экзаменатарамі, сярод якіх былі супрацоўнікі мясцовага гісторыка-краязнаўчага музея і святар жаночага манастыра Алег Плаксіцкі. Бібліяквэст нагадаў вучням імёны іх знакамітых землякоў, у ліку якіх Вера Вярба, чые "Ручнікі" пакладзены на музыку і сталі амаль народнай песняй; Пімен Панчанка – аўтар верша "Ода Талачыну"; Леў Сапега – уладальнік мястэчка Талачын, які пабудаваў тут школу, касцел і бальніцу. Па выніках гэтага інтэлектуальнага спаборніцтва перамагла дружба і вучні атрымалі прызы.

Тэматычны вечар "Любімы сэрцу горад" і гульня-віктарына "Паклон табе, зямля бацькоў" прадоўжылі шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных

юбілею горада. У імпрэзах удзельнічалі навучэнцы старэйшых класаў школ горада. У ходзе мерапрыемстваў выкарыстоўваўся паказ слайдаў і відэастужка вядучага беларускага тэлебачання  Алега Гарбуза "Гісторыя Беларусі: Стары Талачын і хата Льва Сапегі".

Роднаму гораду прысвяціў свае відэастужкі кіраўнік Талачынскай народнай аматарскай кінастудыі "Летапіс" Дзмітрый Іўчанка. У бібліятэцы ім быў прэзентаваны рэтрафотавернісаж "Талачын. Старонкі гісторыі".

На працягу ліпеня, ў кожную нядзелю, у чытальнай зале бібліятэкі праходзіла акцыя “Табе, мой горад, прысвячаю...” Усе жадаючыя змаглі прыняць удзел у акцыі ў фармаце гучных чытанняў. Карыстальнікі бібліятэкі мелі таксама магчымасць сустрэцца ў бібліятэцы з мясцовымі паэтамі, членамі літаратурнай гасцёўні “Друць” і пазнаёміцца з іх творамі. Да акцыі бібліятэкарамі былі падрыхтаваны буклет “Вершы малой радзімы” і выстава-інсталяцыя ў форме літаратурнага дрэва “Гонар нашага краю”, на якім можна пабачыць партрэты славутых землякоў: Веры Вярбы, Алеся Петрашкевіча, Алеся Рылько, Івана Батрака, Нічыпара Пашкевіча, Міхася Зарэцкага, Міхаіла Савіцкага, Лявона Баразны, Валерыя Славука і Васіля Галубовіча.

Добрым і прыгожым выдалася свята горада напрыканцы жніўня месяца мінулага года. Горад наведала шмат гасцей.  Мерапрыемствы пачаліся з тэатралізаванага шэсця "Гісторыя Талачына ў падзеях і асобах". Затым адбылося ўрачыстае адкрыццё мастацкай кампазіцыі "Талака" ў гонар назвы горада. Яна стала своеасаблівым сімвалам урадлівасці, дабрабыту і калектыўнай працы жыхароў нашага горада.

Калектыў бібліятэкі таксама прыняў удзел у свяце. На пляцоўцы, каля будынка бібліятэкі, можна было прайсціся па імправізаваным бульвары і ўбачыць шмат цікавага. Жыхары і госці горада прынялі ўдзел у гульні-віктарыне “Даведайся пра свой горад”. Дарослыя і дзеці з задавальненнем і дакладна адказвалі на пытанні віктарыны і атрымлівалі пачастункі.

З чаго пачынаецца Радзіма? Спадзяёмся, што веды, набытыя на нашых мерапрыемствах, дазволілі кожнаму наведвальніку бібліятэкі зрабіць адказ на гэтае пытанне. Наперадзе, ужо ў новым годзе, іх чакае шмат цікавага і пазнавальнага - гульнёвыя праграмы, інтэлектуальныя спаборніцтвы, краязнаўчыя падарожжы, сустрэчы са знакамітымі землякамі.

Бібліятэкар I катэгорыі
аддзела абслугоўвання і інфармацыі
Талачынскай ЦБС
Ірына Труханёнак
“Бібліятэчны свет” №2 2019г.